УДК 725.182 (476)

***Несцярчук Л.М. Брэсцкі аблвыканкам***

# АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ: СУЧАСНЫ СТАН, ПЕРСПЕКТЫВЫ

У справе аховы і падтрымкі гісторыка-культурнай спадчыны на Брэстчыне захоўваюцца станоўчыя тэндэнцыі.Плённа працуюць абласны, гарадскія і раённыя каардынацыйныя саветы па ахове матэрыяльнай і духоўнай спадчыны.

Разгляд у сакавіку 2010 г. на абласным каардынацыйным савеце дзейнасці Камянецкага і Жабінкаўскага раённых выканаўчых камітэтаў па выкарыстанню помнікаў гісторыі і культуры ў патрыятычным выхаванні моладзі і ўсяго насельніцтва ў ходзе падрыхтоўкі да 65-годдзя Вялікай перамогі даў добрыя вынікі. Паўсюдна помнікі, мемарыялы, воінскія пахаванні прыведзены ў належны стан, на абеліснах устаноўлены нумарныя знакі.

Актыўна ўшаноўваюцца імёны знакамітых суайчыннікаў і гістарычныя падзеі. Толькі за 2009 год, дзякуючы найперш намаганням гаррайвыканкамаў і грамадскасці, ўзведзена і адкрыта 28 новых помнікаў, скульптурных кампазіцый, мемарыяльных знакаў і дошак.

Неабходна адзначыць у гэтым накірунку плённую працу Брэсцкага, Івацэвіцкага, Іванаўскага і Кобрынскага райвыканкамаў.

Як бы ні хацеў хто-небудзь паменшыць значнасць помніка 1000-годдзя горада Брэста, а такія крытыканы ёсць, да таго ж і прэса часам падыгрывае ім, усё ж помнік у Брэсце атрымаўся велічным, а галоўнае атрымаў прызнанне брэстчан.

Мы лічым, што ў рэалізацыі перспектыўнай праграмы рэстаўрацыі і выкарыстання прыярытэтных аб'ектаў вобласці ў мінулым годзе мы мелі станоўчыя зрухі.

За 2005-2009 гады ўведзены ў эксплуатацыю 8 гістарычных аб'ектаў, у тым ліку ў 2009 годзе – адзін з буйных аб'ектаў – палац Бутрымовіча ў Пінску пад Дом грамадзянскіх абрадаў.

Поўнасцю адноўлены гістарычны цэнтр горада Кобрына.

Неблагімі тэмпамі рухаецца рэстаўрацыя Касаўскага палаца і Ружанскага ансамбля, а Касаўскі палац трэці год запар уключаецца ў рэспубліканскую інвестыцыйную праграму з аб'ёмам фінансавання на 2010 год у суме 2,1 млрд. рублёў.

У тых ці іншых тэмпах акрамя Касаўскага і Ружанскага палацаў рухаецца працэс рэстаўрацыі і кансервацыі Нова-Беражноўскага, Скокаўскага, Высокаўскага палацаў, Закозельскай і Грушаўскай гістарычных капліц.

Цяпер актыўна вядзецца праца па падрыхтоўцы канцэпцый па стварэнні ў рэстаўрыруемых палацах і капліцах музейных аб'ектаў. На апошнім каардынацыйным савеце па ахове матэрыяльный і духоўнай спадчыны актыўна абмяркоўвалася канцэпцыя стварэння ў палацы Нямцэвічаў у в. Скокі Брэсцкага раёна музейна-асветніцкага цэнтра. Гэта будзе нетрадыцыйны аб'ект культуры, таму да яго такая пільная ўвага ўлады і грамадскасці.

Упраўленне і аддзелы культуры гаррайвыканкамаў, спецыялісты па ахове гісторыка-культурнай спадчыны сталі займаць больш наступальную пазіцыю ў адносінах да парушальнікаў Закона Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны". Тое, што здарылася з несанкцыя-наваным рамонтам цэркваў у вв. Гошчава Івацэвцкага раёна, у Іванаўскім і Маларыцкім раёнах, выклікае шмат скаргаў і зваротаў грамадзян.

Зараз увага нашага абласнога грамадска-культурнага цэнтра, аддзелаў культуры Ганцавіцкага, Драгічынскага, Жабінкаўскага, Камянецкага, Лунінецкага, Ляхавіцкага і Столінскага райвыканкамаў сканцэнтравана на якаснай падрыхтоўцы дакументаў і ўнясенні аб'ектаў духоўнай спадчыны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Пакуль што мы не можам пахваліцца ў гэтым накірунку працы. У Дзяржаўны спіс унесены толькі мясцовы абрад Намскі Вялікдзень у в.Аброва Івацэвіцкага раёна.

Цапер увага Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Брэсцкага і Гомельскага аблвыканкамаў, Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА сканцэнтравана на праблеме ўнясення ў Спіс Сусветнай спадчыны аб'ектаў драўлянай архітэктуры (храмаў, грамадзянскіх збудаванняў, жыллёвай і гаспадарчай архітэктуры вёскі) на тэрыторыі Палескага рэгіёна.

### 1. МАТЭРЫЯЛЬНАЯ І ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА

1. НЕРУХОМЫЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ, унесеныя ў Дзяржаўны спіс

| Гарады, раёны | Архітэктура | | | | Усяго | Гісторыя | | | | Усяго | Мастацтва | | | | Усяго | Археалогія | | | | Усяго | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 0 | 1 | 2 | 3 | | 0 | 1 | 2 | 3 | | 0 | 1 | 2 | 3 | | 0 | 1 | 2 | 3 | | |
| Міжраённыя | - | - | - | - | - | 1 | - | - | - | 1 | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 1 |
| г. Брэст | - | 1 | 3 | 10 | 14 | - | - | - | 2 | 2 | - | - | 2 | - | 2 | - | - | - | 2 | 2 | 20 |
| Баранавіцкі | - | - | 6 | 12 | 18 | - | - | - | 21 | 21 | - | - | 5 | - | 5 | - | - | - | 7 | 7 | 51 |
| Брэсцкі | - | - | 9 | 3 | 12 | - | - | - | 27 | 27 | - | - | - | - | - | - | - | 1 | 14 | 15 | 54 |
| Бярозаўскі | - | - | 3 | 7 | 10 | - | - | - | 11 | 11 | - | - | - | - | - | - | - | - | 5 | 5 | 26 |
| Ганцавіцкі | - | - | - | 4 | 4 | - | - | - | 1 | 1 | - | - | - | - | - | - | - | - | 10 | 10 | 15 |
| Драгічынскі | - | - | 7 | 14 | 21 | - | - | - | 22 | 22 | - | - | - | - | - | | - | - | 9 | 9 | 52 |
| Жабінкоўскі | - | - | 6 | 5 | 11 | - | - | - | 20 | 20 | - | - | - | - | - | - | - | - | 5 | 5 | 36 |
| Івацэвіцкі | - | 1 | 6 | 14 | 21 | - | - | - | 8 | 8 | - | - | - | - | - | - | - | - | 10 | 10 | 39 |
| Іванаўскі | - | - | 5 | 9 | 14 | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | - | 7 | 7 | 21 |
| Камянецкі | 1 | 1 | 10 | 16 | 28 | - | - | - | 14 | 14 | - | - | - | - | - | - | - | - | 20 | 20 | 62 |
| Кобрынскі | - | - | 12 | 15 | 27 | - | - | - | 12 | 12 | - | - | 1 | - | 1 | - | - | - | 15 | 15 | 55 |
| Лунінецкі | - | - | 3 | 7 | 10 | - | - | - | 3 | 3 | - | - | - | - | - | - | - | - | 7 | 7 | 20 |
| Ляхавіцкі | - | - | 5 | - | 5 | - | - | - | 3 | 3 | - | - | - | - | - | - | - | - | 3 | 3 | 11 |
| Маларыцкі | - | - | 4 | - | 4 | - | - | - | 31 | 31 | - | - | 3 | - | 3 | - | - | - | 7 | 7 | 45 |
| Пінскі | - | 1 | 26 | 8 | 35 | - | - | - | 3 | 3 | - | - | 4 | - | 4 | - | - | - | 16 | 16 | 58 |
| Пружанскі | - | 0 | 7 | 28 | 35 | - | - | - | 36 | 36 | - | - | 2 | - | 2 | - | - | - | 5 | 5 | 78 |
| Столінскі | - | - | 12 | 7 | 19 | - | - | - | 10 | 10 | - | - | - | - | - | - | - | - | 20 | 20 | 49 |
| **Усяго** | 1 | 4 | 124 | 159 | 288 | 1 | - | - | 224 | 225 | - | - | 17 | - | 17 | - | - | 1 | 162 | 163 | 735 |

З гэтай прыемнай нагоды на базе Брэсцкай вобласці ў чэрвені гэтага года плануецца правядзенне Міжнароднай сустрэчы старшынь Нацыянальных камісій па справах ЮНЕСКА і кіраўнікоў дзяржаўных органаў па ахове помнікаў Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы, на якой будуць выпрацоўвацца канцэптуальныя падыходы да вырашэння гэтай архіважкай праблемы.

Ахова, вяртанне да жыцця помнікаў павінна быць заўжды ў цэнтры ўвагі нашых сродкаў масавай інфармацыі, бо гісторыка-культурная спадчына зяўляецца надзейным падмуракам патрыятычнага выхавання нашых грамадзян.

**RESUME**

In business of protection and support of the historical and cultural inheritance in the Brest region positive tendencies remain. Regional, city and district coordination councils on protection of the material and spiritual inheritance work productively. Protection, regeneration of monuments should be always in the centre of attention of mass media because the historical and cultural heritage is a reliable basis of patriotic education of citizens.

УДК 726.71 (476)

***Кожар Н.В., БНТУ, Минск***

## СОВРЕМЕННАЯ ТЕОРИЯ И ПРАКТИКА СОХРАНЕНИЯ И ИСПОЛЬЗОВАНИЯ ИСТОРИКО-АРХИТЕКТУРНОГО НАСЛЕДИЯ

Изучение вопросов охраны исторических объектов и их использования для современных целей является одной из наиболее актуальных задач современной архитектурной науки. Среди публикаций по данной теме можно выделить несколько направлений исследований. Это работы, посвященные разработке проблем исто-рической застройки городов, и труды, предметом которых является изучение конкретных памятников истории и культуры с предложениями